# УДЗЕЛ ІНДЫВІДУАЛЬНА-АЎТАРСКІХ НЕАЛАГІЗМАЎ У ГУКАВОЙ АРГАНІЗАЦЫІ ПАЭТЫЧНАГА ВЕРША

***Кудласевіч Г.М.*** *(УА МДПУ імя І.П. Шамякіна, г. Мазыр)*
***Навуковы кіраўнік –*** *І.М. Мацвеенка, выкладчык*

У паэтычным маўленні фанетычныя сродкі выразнасці адыгрываюць выключна важную ролю. Гукі, самі па сабе і ў спалучэннях, разам з рыфмай, рытмам, інтанацыяй, утвараюць мілагучнасць (эўфанію), што садзейнічае ўзмацненню асацыяцый і ўтварэнню больш яркіх і экспрэсіўных вобразаў. Дасягненню гукавай гармоніі дапамагае пэўнае чаргаванне галосных і зычных, напрыклад, *Мне зразумела ўсё і ўсё не ясна – Ці варты музыкі такой?! Ці варты я хвіліны гэтай шчаснай, Калі гучаць арфічна вашы астры Па-над пустой канцэртнай асакой* (Л. Дранько-Майсюк). У гэтай страфе раўнамерна спалучаюцца галосныя і зычныя, адсутнічаюць цяжкія для вымаўлення спалучэнні зычных – усё гэта і надае вершу музыкальнасць і меладычнасць. Парушыць эўфанію можа вялікая колькасць зычных, асабліва на стыку слоў, ужыванне побач некалькіх галосных, паўтарэнне аднолькавых спалучэнняў гукаў або слоў. Адзначым, што ў паэтычным маўленні такія парушэнні іншы раз з'яўляюцца элементам моўнай гульні, заснаванай на паранімічнай атракцыі (тэрмін В. П. Грыгор'ева), напрыклад, ***Трысвечча****. Трохкутнік. Трысцё. Трысцен. Трыадзінства. Трыпутнік* (Р. Барадулін). Выкарыстанне сугучных узуальных і аказіянальнага слова прыводзіць да ўзнікнення фанетычных асацыяцый. Комплекс гукаў *[тр]*, які паўтараецца некалькі разоў, уступае ў сувязь з семантыкай слоў і прыводзіць да іх семантычнага зблiжэння.

Гукавая арганізацыя твора заўсёды знаходзіцца ў цэнтры ўвагі пісьменнікаў і паэтаў. Для рэалізацыі сваіх задум яны падбіраюць такія словы і гукі, якія прымушаюць чытача думаць, хвалявацца. І даволі часта з гэтай мэтай утвараюцца і ўжываюцца індывідуальна-аўтарскія неалагізмы, якія разам з узуальнымі словамі садзейнічаюць лепшай гукавой арганізацыі твора: *Прагрукатаў над доламі Нёманскі* ***крыгагром****. Грудзі дыхнулі донныя І воляю, і цяплом* (К. Камейша) – спалучэнне слоў з гукамі *[р], [г]* нагадвае трэск ад разлому крыг; *У кашы мурашы З шэранькаю мышкай* ***Шаршацелі*** *шышкай: – Шы-шы-шы, шы, шы, шы...* (В. Шніп) – паўтарэнне зычнага гука *[ш]* стварае гукавыя асацыяцыі, звязаныя з шумам, шорахам, шапаценнем.

Такім чынам, гукавая абалонка наваўтвораных слоў працуе на эўфанічную арганізацыю твора, дапамагае стварыць яркі паэтычны вобраз.

**Літаратура**

1. Торра, В.А. Закаханы ў кожны гук чароўны. Эўфанічная арганізацыя паэтычнай мовы Р. Барадуліна / В.А. Торра // Роднае слова. – 2005. – № 2. – С. 13–16.

2. Журавлёв, А.П. Звук и смысл : кн. для внеклас. чтения уч ст. клас. / А.П. Журавлёв. – 2-е изд., испр. и доп. – М. : Просвещение, 1991. – 160 с.

МГПУ им. И.П. Шамякина